# Свет дзяцінства

## ў фотаздымках пачатку XX стагоддзя

Мы любім фатаграфаваць нашых дзяцей, хлопчыкаў і дзяўчынак, разумеючы, што калі-небудзь яны стануць дарослымі, зменяцца ўнутрана і знешне, але напэўна будуць з задавальненнем разглядаць свае першыя здымкі, успамінаць той бясхмарны свет, які назаўжды застанецца зафіксаваны на пажоўклых ад часу фатаграфіях. На іх усмешлівыя і сур'ёзныя дзяўчынкі з банцікамі альбо апранутыя ў сінія матроскі ці ў карнавальныя касцюмы хлопчыкі… Хтосьці трымае ў руках любімую ляльку, хтосьці – каляровыя алоўкі, хтосьці збірае з кубікаў вежу або ўзводзіць на сонечным марскім беразе замак з пяску. Не забудзем і пра школьныя гады: першы раз у першы клас, выпускны вечар і гэтак далей. І тут нельга не пагадзіцца з выдатнымі словамі пісьменніцы Наталлі Грот: «Збіранне сямейных паданняў і матэрыялаў, жывых і пісьмовых, дакументальных – замест назапашвання зямных багаццяў – для дзяцей і ўнукаў значна больш карыснае і настолькі ж вышэй, наколькі духоўнае вышэй за матэрыяльнае… У гэтым выяўляюцца шырока свядомыя адносіны чалавека да жыцця. Шчаслівы той, хто зразумеў гэта».

На старонках «Беларускай думкі» мы вырашылі паказаць дзіцячыя фотаздымкі пачатку XX стагоддзя, каб вы, нашы чытачы, змаглі зазірнуць у эпоху, у якой жылі нашы бабулі і дзядулі, адчуць атмасферу мінулага і проста палюбавацца на чыстыя, светлыя дзіцячыя твары.

**Аляксандр САМОВІЧ,**
**доктар гістарычных навук**
**Фота з калекцыі аўтара**




























